**12 ліпеня 2024 г. – 85 гадоў з дня нараджэння Пятра Дзянісавіча Селюка (1939-2010), ганаровага грамадзяніна горада Кобрына, заслужанага настаўніка працуючай моладзі БССР**



Пётр Дзянісавіч Сялюк нарадзіўся 12 ліпеня 1939 года ў в. Філіповічы Капаткевіцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. На яго долю выпаў лёс мільёнаў дзяцей вайны. Каб выратаваць свайго адзінага сына, маці Пятра перабралася з разбуранай фашыстамі Гомельшчыны на захад Беларусі. Так горад Кобрын стаў другой радзімай Пятра Селюка.

Пасляваенныя часы былі цяжкімі, фашысцкія акупанты пакінулі пасля сябе руіны. Людзі жылі ў беднасці, прыходзілася выжываць, на работу ўладкавацца было складана. Пётр Сялюк вучыўся ў сярэдняй школе № 2 г. Кобрына і вельмі жадаў набыць рабочую спецыяльнасць, каб была ўпэўненасць у заўтрашнім дні. У 1957 годзе, скончыўшы 8 класаў, юнак пачаў сваю працоўную біяграфію аўтаслесарам пры вайсковай часці ў п. Мачулішчы Мінскага раёна. Пасля працы прыходзіў у Мінскі аэраклуб, дзе вучыўся на курсах пілота, неаднаразова рабіў вылеты на спартыўным самалёце «ЯК-18».

У студзені 1958 года П. Сялюк вярнуўся ў г. Кобрын. Нейкі час працаваў у друкарні. Потым, з верасня 1959 года і да да выхаду на пенсію, месцам яго працы стаў Кобрынскі рамонтны завод (цяпер ААТ «САЛЕА-Кобрын»). Пачынаў з падсобнага рабочага, быў слесарам, фрэзероўшчыкам, токарам, наладчыкам. Усімі гэтымі прафесіямі ён авалодаў у дасканаласці. У 1961 годзе скончыў школу працоўнай моладзі.

Старанне рабочага адзначалася рознымі званнямі, граматамі. У 1971 годзе яму было прысвоена званне «Ударнік камуністычнай працы». За высокія паказчыкі ў працы П. С. Сялюк удастоены ордэнамі Працоўнай Славы III (1975) і II (1986) ступеняў, ордэнам «Знак Пашаны» (1977), медалямі «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина» (1970), «Ветеран труда» (1984). Неаднаразова з’яўляўся пераможцам сацыялістычных спаборніцтваў, прызнаны лепшым па

прафесіі, унёс мноства рацыяналізатарскіх прапаноў. Быў удзельнікам выстаў ВДНГ СССР (1971) і ВДНГ БССР (1979).

На заводзе П. Д. Сялюк з'яўляўся старшынёй Савета настаўнікаў моладзі. У 1976 годзе ўзнагароджаны нагрудным знакам «Настаўнік моладзі». 31 мая 1978 года Пятру Дзянісавічу як высокакваліфікаванаму настаўніку моладзі за заслугі ў навучанні юнакоў і дзяўчат прафесіянальнаму майстэрству было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік працуючай моладзі Беларускай ССР».

Пётр Дзянісавіч актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці завода, горада. Быў членам бюро гарадскога камітэта КПБ і партбюро завода, дэлегатам XXVIII з'езда КПБ і XXVI з'езда КПСС. Узнагароджваўся Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (1999), быў занесены на Дошку гонару і ў Кнігу гонару завода.

У год святкавання 700-годдзя Кобрына П. Д. Селюку было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына» (рашэнне Кобрынскага гарсавета № 237 от 15.09.1987 г.).

Пётр Дзянісавіч Сялюк памёр 28 снежня 2010 года. Яго жыццёвае крэда было простым і высакародным - рабіць дабро.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай
цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

**Заслужаныя** настаўнікі працуючай моладзі Беларускай ССР. 1978. П. Д. Сялюк // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1998. - Т. 6. - С. 555.

**Долготович, Б. Д.** Селюк Петр Денисович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32.

**Сялюк Пётр Дзянісавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – 2-е выд., дап. – Кобрын, 2020. – С. 30-32 : фат.

**Сялюк Пётр Дзянісавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 76 : фат.

**85 гадоў** з дня нараджэння П. Д. Сялюка (1939) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 133-134.

**Курачук, С.** История кобринского края в лицах. Почетный гражданин города Кобрина. В. Н. Кирманович, И. Ф. Милоянин, П. Д. Селюк, А. М. Мартынов / страницу подготовила Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2021. – 29 апреля (№ 17). – С. 4. – Продолжение. Начало в № 12 от 25 марта 2021 г.

**Селюк Петр Денисович** : некролог / районный исполнительный комитет, районный Совет депутатов // Кобрынскі веснік. – 2011. – 5 студзеня. – С. 3.

**Мельнік, Р.** Жыццевае крэда Пятра Селюка / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2006. – 22 ліпеня.

**Пётр Дзянісавіч Сялюк** // Кобрынскі веснік. – 2002. – 20 ліпеня. - С. 2. - (Кобрына Ганаровыя грамадзяне).

**Сялюк, П. Д**. Адзіная прывілея – быць заўсёды наперадзе / П. Д. Сялюк // Камуністычная праца. - 1985. - 13 красавіка.

**[Вярнуўшыся** з XXVI з’езда КПСС] // Камуністычная праца. – 1981. – 7 сакавіка.

Вярнуўшыся з XXVI з’езда КПСС, яго дэлегат, токар рамонтнага завода Пётр Дзянісавіч Сялюк, падзяліўся з таварышамі сваімі ўражаннямі.

**Зыбайла, І.** На ўдарнай вахце / І. Зыбайла // Камуністычная праца. – 1981. – 17 студзеня.

Токар рамонтнага завода, дэлегат XXVI з’езда КПСС П. Д. Сялюк задае тон у сацыялістычным спаборніцтве.

**Зыбайло, И.** С помощью наставников / И. Зыбайло // Заря. - 1981. - 27 марта.

Кобринский ремонтный завод.

**Лясняк, П.** Побач – настаўнік / П. Лясняк // Камуністычная праца, 1981. - 6 кастрычніка.

**Праводзілі** делегата на з'езд // Камуністычная праца. – 1981. – 21 лютага.

Урачыста праводзілі ўчора на XXVI з'езд КПСС токара рамонтнага завода Пятра Дзянісавіча Селюка яго таварышы па працы.

**Петр Денисович Селюк**, токарь Кобринского авторемонтного завода // Камуністычная праца. – 1981. – 3 лютага.

**Романов, В.** Простые истины / В. Романов // Заря. – 1981. - 17 января.

Вся рабочая биография Петра Денисовича Селюка связана с Кобринским авторемзаводом.

**Селюк, П. Д.** Давать бой равнодушию / Петр Денисович Селюк // Заря 1981. – 11 июля. – С. 2.

Токарь Кобринского авторемонтного завода, член бюро горкома КПБ П. Д. Селюк.

**Сялюк, П.** За якасць у адказе кожны / П. Сялюк // Камуністычная праца. - Кобрын, 1981. - 9 красавіка.

**Сялюк, П.** Мы – настаўнікі / П. Сялюк // Звязда. - 1977. - 25 лютага.

Аб рабоце савета настаўнікаў на Кобрынскім рамонтным заводзе

**Віктаровіч, А**. Руху настаўнікаў – партыйны клопат / А. Віктаровіч // Камуністычная праца, 1976. - 18 верасня.

На Кобрынскім рамонтным заводзе.

**О награждении** орденами и медалями СССР рабочих, инженерно- технических работников и служащих предприятий и организаций Всесоюзного объединения «Союзсельхоз-техника» Совета Министров СССР. Селюка Петра Денисовича // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф.186.Оп. 1. Д. 617. Л. 29.

**О представлении** к награде Селюка П. Д**.** / ОАО «Завод гидравлического машиностроения» // Зональный государст-венный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 6. Д. 331. Л. 12.

**О представлении** к награждению Почетной Грамотой Совета Министров Республики Беларусь Селюка Петра Денисовича : решение Кобринского районного исполни-тельного комитета, 27.04.1999 г., № 257 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 6. Д. 331. Л.11.

**Представление** к награждению Почётной грамотой Совета Министров Республики Беларусь Селюка Петра Денисовича : приложение к Положению о Почётной грамоте Совета Министров Республики Беларусь, утверждённому постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 февраля 1997 г. № 80 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 6. Д. 331. Л. 14.

**О присвоении** звания Почетных граждан города Кобрина [Милоянину И. Ф., Кирмановичу В. Н., **Селюку П. Д**.] : решение Кобринского городского Совета народных депутатов, 15.09.1987 г., № 237 // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 4. Д. 149. Л. 14.

**Список** Кобринского ремонтного завода Брестской области Белорусской ССР на лиц, представляемых к награждению юбилейной медалью «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина» Селюка Петра Денисовича // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 254. Лл. 28, 40, 44.

Кобрынскі раён

Кобрын

Кобрынскі рамонтны завод

Сялюк Пётр Дзянісавіч

Ганаровыя грамадзяне

Настаўнікі моладзі

**Селюк, П. Д.** Давать бой равнодушию / Петр Денисович Селюк // Заря. - 1981. – 11 июля. – С. 2.

Токарь Кобринского авторемонтного завода, член бюро горкома КПБ П. Д. Селюк.

**Романов, В.** Простые истины / В. Романов // Заря. – 1981. - 17 января.

Вся рабочая биография Петра Денисовича Селюка связана с Кобринским авторемзаводом.

[**Вярнуўшыся** з XXVI з’езда КПСС] // Камуністычная праца. – 1981. – 7 сакавіка.

Вярнуўшыся з XXVI з’езда КПСС, яго дэлегат, токар рамонтнага завода Пётр Дзянісавіч Сялюк, падзяліўся з таварышамі сваімі ўражаннямі.

**Селюк Петр Денисович** // Список почетных граждан города Кобрина / отдел идеологической работы Кобринского исполкома. – Кобрин, 2002. – С. 1.

**Протокол** вручения юбилейной медали «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина» **Селюку Петру Денисовичу** // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 342. Лл. 10, 12.

**Список** Кобринского ремонтного завода Брестской области Белорусской ССР на лиц, представляемых к награждению юбилейной медалью «За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина». **Селюка Петра Денисовича** // Зональный государственный архив в г. Кобрине. - Ф. 186. Оп. 1. Д. 254. Лл. 28, 40, 44.